*Петрыман К. Л., Каласоўская В. У.*

# «ТАБЕ, НАШЧАДАК, У ДОБРЫ ДАР...»
## НОВЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ ФІЛІЯЛА НММ РБ «ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС «МІР» З РОЗНЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

У канцы XX ст. шматлікія музеі краіны ад правядзення асобных мерапрыемстваў для наведвальнікаў перайшлі да стварэння сістэмы работы з усімі ўзроставымі групамі — дарослымі, дзецьмі, падлеткамі, юнацтвам. Упершыню ў даволі шырокіх межах было пастаўлена пытанне аб мэтанакіраванай рабоце з пэўнай (адной і той жа) аўдыторыяй, аб неабходнасці выкарыстання найбагацейшага выхаваўчага патэнцыялу, якім валодае музей як сацыяльны інстытут.

Стварэнне такой сістэмы павінна было спрыяць далучэнню грамадства да музея, стымуляваць дзейнасць самых шырокіх колаў насельніцтва па вывучэнню і ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Канешне, пры гэтым асаблівая ўвага павінна была быць накіравана на падрастаючае пакаленне.

Падрастаючым пакаленнем прынята лічыць дзяцей малодшага ўзросту, падлеткаў і юнацтва. Музеі рэспублікі ўжо звярнулі сваю ўвагу на работу з імі. Традыцыйнымі сталі канцэрты і тэатральныя пастаноўкі ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, літаратурныя салоны і батлеечныя спектаклі ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Вопыт работы музейных клубаў ёсць у шматлікіх музеях краіны, але найбольш эфектыўна ён выкарыстоўваецца і дае станоўчыя вынікі ў мастацка-адукацыйнай студыі «У госці да Цюбіка». Яна працуе больш за пятнаццаць гадоў у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Музейныя заняткі як форма культурна-адукацыйнай работы праводзяцца ў Гісторыка-культурным запаведніку «Заслаўе» (з 1989 г.), Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, На-

цыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Браслаўскім раённым аб'яднанні музеяў, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўнікамі аддзела навукова-асветніцкай работы НММ РБ распрацаваны праграмы цыкла музейна-педагагічных заняткаў для филияла музея «Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX стагоддзя» (адрасавана старшакласнікам і студэнтам), музейны занятак «Партрэты даўнія мінулых пакаленняў» (адрасавана дзецям сярэдняга школьнага ўзросту) і іншыя.

Такім чынам, адбываецца стварэнне цэласнай сістэмы, арыентаванай на мэтанакіраванае далучэнне канкрэтнай аўдыторыі да музея. Музейная інфармацыя падаецца ў даступнай, цікавай форме, прапускаецца праз пачуцці наведвальнікаў, улічваюцца ўзроставыя асаблівасці.

Спробу ў распрацоўцы музейнага занятку зрабіў і філіял НММ РБ «Замкавы комплекс Мір».

Статыстычныя даныя 2000–2004 гг. сведчаць, што абсалютную большасць наведвальнікаў філіяла склалі менавіта падлеткі. Таму проста неабходна было прапанаваць дзецям заняткі, разлічаныя менавіта на іх, якія б дапамаглі развіццю самастойнага мыслення, умення ўспрымаць твор мастацтва, творчых магчымасцяў асобы, фарміраванню мастацкага густу, эмацыянальнай культуры.

Любому музейнаму педагогу вядома, што, перш чым брацца за распрацоўку канкрэтнага занятку для пэўнай катэгорыі наведвальнікаў, трэба добра ведаць яе, вывучыць яе псіхалагічныя, узроставыя асаблівасці і магчымасці ўспрымання музейнай інфармацыі. Гэта і было зроблена. Былі вывучаны асаблівасці сярэдняга школьнага ўзросту.

Сярэдні школьны ўзрост (прыкладна 10–13 гадоў) — вельмі складаны. Гэта такі час у жыцці дзіцяці, калі фарміруюцца нормы і спосабы зносін з іншымі людзьмі. Агульначалавечыя каштоўнасці, паняцці дабра, роўнасці, прыгажосці, розуму разумеюцца канкрэтна і прымяняюцца ў адносінах з равеснікамі і дарослымі, у адносінах да самога сябе, каб пазней стаць агульнымі гуманістычнымі каштоўнасцямі. Гэты ўзрост называюць яшчэ ўзростам пошуку другога чалаве-

ка. А пошук другога — гэта адначасна пошук і самога сябе, сваёй індывідуальнасці. Індывідуальнасць чалавек набывае там, дзе ён вучыцца здзяйсняць учынкі — рабіць выбар, заснаваны на прадбачанні сваіх дзеянняў для іншых.

Які я? Чаму жывуць людзі? Што я магу? Гэтыя пытанні задаюцца ў падлеткавым ўзросце, і часта пошук адказаў на іх складае значную частку перажыванняў.

Падрыхтоўка да музейнага занятку складалася не толькі з вывучэння псіхалагічных асаблівасцяў дзяцей гэтага ўзросту, але і з вызначэння мэты і задач, выбару месца і адбору матэрыялу.

Мэтай занятку стала выхаванне музейнай культуры і павагі да гісторыка-культурнай каштоўнасці — Мірскага замка. Задача музейнага педагога была ў тым, каб праз ролевую гульню раскрыць працэс першапачатковага будаўніцтва Мірскага замка ў пачатку XVI ст., стварыць вобраз Галоўнага майстра — архітэктара, ад якога залежала ўсё, пачынаючы ад распрацоўкі плана будучага аб’екта да гатовага будынка. Праз «пагружэнне» ў мінулае дзеці («стаўшы» памочнікамі Галоўнага майстра) павінны былі адчуць на сабе ўсю сур’ёзнасць і адказнасць справы, за якую ўзяліся, а таксама нялёгкую працу будаўнікоў.

Музейны занятак спланаваны такім чынам:

1) Папярэдняя гутарка з дзецьмі.
2) Аповяд пра замак і яго заснавальніка, такую гістарычную асобу, як Юрый Ільініч — надворны маршалак:
   а) «пагружэнне ў мінулае» (ролевая гульня — музейны педагог становіцца Галоўным майстрам, а дзеці — яго памочнікамі. Дзеянні адбываліся (умоўна) у паселішчы Мір 500 гадоў таму);
   б) разгляд асноўнага будаўнічага матэрыялу Мірскага замка — цэглы;
   в) працэс будаўніцтва.
3) Заключны этап і падвядзенне вынікаў.

Музейны педагог сустракаў групу дзяцей акрэсленага ўзросту перад галоўнай вежай замка. Уступная гутарка складалася з прывітання і знаёмства. Тут жа быў прыменены даўно вядомы і прак-

тыкуемы музейнымі педагогамі прыём: бэйджы з імёнамі. Дзякуючы гэтаму размова з дзецьмі на працягу ўсяго занятку была непрымусовай, складалася атмасфера даверу, саўдзелу.

Пасля гэтага засяроджвалася ўвага дзяцей на велічным помніку архітэктуры — Мірскім замку. Адказваючы на пытанні, удзельнікі занятку апісвалі яго, называлі мэты будаўніцтва, узгадвалі прафесію архітэктара, пасля слухалі аповяд пра гаспадара Міра — Юрыя Ільініча і Галоўнага майстра.

Аб’ектам даследавання і вывучэння быў выбраны менавіта замак як вынік сур’ёзнай і вельмі адказнай працы майстра і яго памочнікаў.

Падчас правядзення асноўнай часткі занятку выкарыстоўвалася ролевая гульня. Музейны педагог станавіўся Галоўным майстрам, а ўдзельнікі — яго памочнікамі. Праз яе адбывалася актывізацыя творчага ўспрымання і асэнсавання музейнага матэрыялу. Гульня была эфектыўным спосабам засваення культурна-гістарычнай спадчыны, сродкам зносін дзяцей з «дарослай» культурай. Праходзіла яна ў межах экспазіцыі Паўднёва-Заходняй вежы, у двары замка і вакол яго.

Ролевую гульню арганізоўваў музейны педагог і сам у ёй удзельнічаў. Пры гэтым прымяняўся яшчэ адзін метад: пытанняў і адказаў. Ён спрыяў развіццю ўважлівасці, актывізацыі памяці, дапамагаў падвесці да патрэбнай думкі і вываду. Хоць гэты метад і з’яўляецца ня простым, бо уключае ў сябе элемент непрадбачанасці, ён быў выкарыстаны нароўні з ролевай гульнёй. Калі на першых занятках прыходзілася імправізаваць, быць вынаходлівым, выслухваючы і задаючы наводныя пытанні, то пасля ўжо можна было ўявіць, які адказ прагучыць, удакладніць яго або дапоўніць.

Не адзін музейны занятак не абыходзіцца без аповяду, апісання, тлумачэння музейнага педагога. Не абышлося без гэтага і тут. Аповяд пра гаспадара Міра і яго жаданне пабудаваць замак гучаў вобразна, эмацыянальна. «Маналог» не быў доўгім па часе.

Падчас працы з дзецьмі выкарыстоўваліся старажытныя адзінкі вымярэння даўжыні — локаць, сажань; узгадваліся тагачасныя транспартныя сродкі, разглядаліся ўзоры адзення,

калі абмяркоўвалі працу людзей розных прафесій з копіі гравюры Ф. Скарыны XVI ст., змешчанай на першым ярусе Паўднёва-Заходняй вежы. Менавіта праз гэтыя, на першы погляд, дробязі, адбывалася «пагружэнне ў мінулае» на 500 гадоў.

І вось памочнікі разам з Галоўным майстрам апісваюць цэглу-пальчатку, вызначаюць яе памеры, форму, матэрыял, з якога гэта зроблена. Пасля зноў аглядаюць замак і з лёгкасцю называюць цэглу асноўным будаўнічым матэрыялам. Пры гэтым дадаюць, што яна не танная.

Не абышлося на занятку і без заданняў. Некаторыя з іх былі вельмі простыя і выконваліся за адну-дзве хвіліны. Гэта вызначэнне пляцоўкі для будучай пабудовы, падлік колькасці цэглы, змешчанай у адным локці, перанясенне плана замка на зямлю.

Больш часу заняў агляд усіх паверхаў галоўнай вежы і вылучэнне падабенства і розніцы паміж дзвюма вежамі — Паўднёва-Заходняй і Цэнтральнай. Гэтым музейны педагог засяроджваў увагу дзяцей на форме вежаў, іх функцыянальным прызначэнні і мастацкім аздабленні, якое грунтуецца на розных па форме і велічыні дэкаратыўных нішах і арнаментальных паясах, на іх маляўнічасці, якая ўзмацняецца каляровым афармленнем.

Напрыканцы занятку адбывалася абагульненне ўсяго сказанага, дзе гаварылася пра таленавітага народнага майстра, які валодаў багатым мастацкім густам і пачуццём прапорцый, быў добра знаёмы з архітэктурай суседніх народаў і змог стварыць першакласнае для таго часу абарончае збудаванне, аздобіўшы яго суровае аблічча цудоўнай гармоніяй фарбаў і разнастайных архітэктурных дэталяў.

Перад развітаннем усім удзельнікам раздавалася крыжаванка. Разгадаўшы яе дома, яны самастойна замацоўвалі набытыя падчас музейнага занятку веды.

## Батлейка як адна з формаў музейнай працы

Музей з'яўляецца адной з форм калектыўнай памяці грамадства, каштоўнасных адносін чалавека да рэчаіснасці, падтрымкі традыцый, а таксама сродкам масавай камунікацыі.

У наш час вельмі актуальным з'яўляецца пытанне фарміравання ў наведвальнікаў музея новых прыярытэтаў, якія праяўляюцца ў павазе да гісторыі і ўменні ацэньваць у рэальным жыцці прадметы музейнага значэння. Таму сёння музей становіцца месцам існавання новых адносін паміж чалавекам і гісторыяй, адносін у форме культурна-гістарычнага дыялога, паспяховай рэалізацыі і эфектыўнасці якога павінны садзейнічаць новыя формы зносін наведвальніка музея з культурнымі каштоўнасцямі.

Заўсёды трэба памятаць, што асноўным каналам музейнай камунікацыі з'яўляецца музейная экспазіцыя як своеасаблівы від мастацтва; яна ўсё часцей патрабуе ўвагі да сваёй мастацкай сутнасці шляхам стварэння сцэнарыя як яе драматургічнай асновы.

Нашаму сённяшняму наведвальніку павінна быць прадастаўлена магчымасць не толькі пасіўна ўспрымаць прэзентуемую інфармацыю, але і стаць як бы непасрэдным удзельнікам тых альбо іншых падзей, аб якіх распавядаюць музейныя прадметы і навукова-дапаможны матэрыял. Мірскі замак ужо сам па сабе з'яўляецца экспанатам са сваёй багатай гісторыяй, больш таго, ён здольны толькі адным сваім знешнім выглядам выклікаць моцныя эстэтычныя ўражанні. Таму сёння мы ставім сваёй мэтай скіраваць энергетыку гэтых уражанняў для суперажывання гістарычнай складовай не толькі выдатнага помніка айчыннай архітэктуры, якім з'яўляецца Мірскі замак, але і самога мястэчка Мір. Такое спалучэнне эстэтыкі і гістарычнасці мы бачым у выкарыстанні ў працэсе музейных заняткаў спектакляў народнага тэатра батлейка.

Беларускі народны тэатр батлейка з'яўляецца адным са старажытных відаў беларускага мастацтва. Сама назва тэатра паходзіць ад назвы горада Віфлеем (польск. betlejka ад Betleem = польская назва горада Віфлеема), дзе нарадзіўся Ісус Хрыстос. Таму па Беларусі сустракаюцца яшчэ назвы «батляемка», «бетлейка». Сувязь назвы батлейкі з тэматыкай Новага Запавету падкрэслівае кананічны сюжэт прадстаўлення «Цар Ірад». Першыя пісьмовыя ўпамінанні пра батлейку на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XVI ст.

Батлеечныя паказы на тэрыторыі Беларусі адрозніваліся большай поліканфесіянальнай скіраванасцю, што звязана, безумоўна,

з нацыянальнай рысай талерантнасці беларускага народа і імкненнем батлеечнікаў падараваць людзям радасць вялікага свята незалежна ад іх веравызнання. Беларуская батлейка XIX–XX стст. займае вялікае месца ў культуры Беларусі. Менавіта ў гэты час майстры-батлеечнікі больш выразна фарміруюць тыпалогію батлеечнага тэатра, яго канструктыўныя асаблівасці, сістэмы ўладкавання лялек. Заняпад батлеечных прадстаўленняў на тэрыторыі нашай краіны назіраўся з другой паловы XIX ст., што, магчыма, можна звязаць з падаўленнем паўстання 1863 г.

У пачатку XX ст. ладзіліся прадстаўленні ў Мінску (1915), Докшыцах, Маладзечне, Міры і іншых населеных пунктах Навагрудскага павета (20–30-я гг. XX ст.). Дарэчы, адно з апошніх прадстаўленняў батлейкі ладзіў у Маскве на Усерасійскай саматужна-прамысловай выстаўцы ў 1923 г. мірскі батлеечнік Мацей Барашка з сынам Іларыёнам. Апошнія прадстаўленні батлейкі прайшлі ў канцы 50-х — пачатку 60-х гг. XX ст. у Міры і на Случчыне.

Аб багатых батлеечных традыцыях Міра сведчыць перш за ўсё той факт, што, нягледзячы на заняпад батлейкі на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст., у Міры працягвалі ладзіцца батлеечныя прадстаўленні. Мірскі батлеечнік Мацей Барашка разам з жыхаром вёскі Краснае А. Монічам хадзілі з батлейкай па ўсім тагачасным Навагрудскім павеце і ладзілі прадстаўленні.

Што тычыцца старажытных паказаў батлейкі ў Міры, то аб іх нам пакуль невядома. Але трэба памятаць пра тое, што з XVII ст. Мір з’яўляўся адным з цэнтраў рамесніцтва, і не толькі ў сваім рэгіёне. Таму можна меркаваць, што багатая матэрыяльная культура тагачаснага Міра была непарыўна звязана з духоўнай культурай людзей, якія мелі самае непасрэднае дачыненне да яе стварэння. Мы спадзяёмся ў будучым знайсці сведчанні аб тых далёкіх батлеечніках-міранах, каб яшчэ больш поўна прадстаўляць цікавую і таямнічую з’яву мірскай батлейкі, якая адрадзілася ў канцы XX ст. у Мірскім мастацкім прафтэхвучылішчы № 234 будаўніча-рэстаўрацыйных работ (цяпер Мірскі мастацкі каледж).

З адкрыццём гэтай навучальнай установы ідэя адраджэння рамёстваў у Міры нарэшце атрымала доўгачаканае ўвасабленне. Але адраджэнне забытых, амаль страчаных промыслаў беларусаў было б немагчымым без адраджэння аўтэнтычнай культуры народа, яго звычаяў і традыцый. Гэта добра разумелі майстры, педагогі і вучні вучылішча. Патрэбен быў чалавек, які б даў штуршок гэтаму адраджэнню, стаў бы яго «мецэнатам». Такім чалавекам і стала Галіна Пятроўна Жаровіна, член Саюза архітэктараў Беларусі, арганізатар і кіраўнік тэатра-студыі «Батлейка» пры Мірскім МПТВ-234.

Напрыканцы 1989 г. удзельнікі «Батлейкі» зрабілі першую скрыню з лялькамі — копію магілёўскай батлейкі, арыгінал якой знаходзіцца ў Расійскім этнаграфічным музеі (Санкт-Пецярбург). А далей была праца па аздабленню батлейкі, вывучэнню і засваенню рухаў лялек, і пад новы, 1990 год адбылося першае выступленне сучасных мірскіх батлеечнікаў у Мірскай сярэдняй школе.

Батлейка пачынала ажываць, яна вярталася з небыцця намаганнямі педагогаў і студэнтаў вучылішча. Майстар-ганчар Міхаіл Мікалаевіч Шапяленка, студэнтка Беларускай акадэміі мастацтваў Элеанора Іванаўна Ляхновіч, а затым выкладчык вучылішча Ганна Альбертаўна Выгонная, член Беларускага саюза мастакоў, майстар-разьбяр і ганчар Іван Іванавіч Карп — дзякуючы намаганням гэтых людзей, іх самаадданай і плённай працы свет убачыў амаль страчаную старонку нашай нацыянальнай культуры — батлейку.

Самаадданы пошук, вера ў тое, што кожнае намаганне набліжае да жаданай мэты — вось чым жылі і жывуць батлеечнікі.

Шмат увагі ўдзялялася ў працэсе пошуку этнаграфічнай складовай збору друкаваных і архіўных звестак, графічных матэрыялаў, фіксацыі тых батлеек, якія засталіся ў музеях Масквы і Санкт-Пецярбурга. І вось доўгачаканы вынік плённай працы — знойдзены звесткі пра апошніх мірскіх батлеечнікаў. Гэта былі браты Сілко, якія ў канцы 50-х — пачатку 60-х гг. XX ст. ладзілі апошнія прадстаўленні батлейкі наМіршчыне. На вялікі жаль, ні матэрыяльных, ні пісьмовых сведчанняў гэтага факта не знайшлося, толькі некалькі фатаграфій, на якіх можна бачыць братоў-музыкаў, але без батлейкі.

Адроджаныя прадстаўленні батлейкі даволі добра адчувалі сябе ў сучасным інфарматызаваным свеце. Здавалася, нешта таямнічае хаваецца ў батлеечных строях і толькі чакае моманту, каб вырвацца на волю.

Так, батлейка жыла, але ўсім хацелася, каб яна жыла не толькі каляднымі святамі, а і ўвесь год.

Вось тут і адкрылася тая таямніца. Гэта была таямніца Міра і Радзівілаў. Так, Радзівілы прыйшлі ў батлейку, прыйшлі не гасцямі, а паўнапраўнымі гаспадарамі і мецэнатамі духоўнай спадчыны беларускага Рэнесанса, заснавальнікамі і захавальнікамі вялікай культуры рамяства і мастацтва.

Радзівілам у батлейцы Мірскага ДМПТВ-234 прысвечаны цэлы цыкл спектакляў пад агульнай назвай «Радзівіліяда». «Мара», «Міракль аб Уршулі», «Як Аня імя шукала», «Чароўная крыніца», «Ад Рыма да Міра», «Гусіная песня», «Італьянскі сад» — гэта аповяды аб майстрах і мецэнатах краю, заснаваныя на рэальных гістарычных фактах і падзеях.

Сёння ўпэўнена можна гаварыць, што мірская «Батлейка» аднавіла традыцыі яшчэ адной вельмі цікавай з'явы ў культуры Беларусі — школьнага тэатра. Як і ў гістарычным школьным тэатры (напрыклад, школьны тэатр Забельскай дамініканскай гімназіі пад Полацкам і драматургія Каятана Марашэўскага), п'есы мірскай «Батлейкі» — гэта амаль заўсёды драмы-маралітэ, толькі з іншымі падзеямі і зместам, але вынік аднолькавы — герой-сучаснік праз зносіны, часам нават спантанныя, з рэальнымі асобамі гістарычнай спадчыны краіны становіцца больш свядомым, а жыццё яго — больш асэнсаваным.

Сведчаннем мастацкай сталасці тэатра стала правядзенне ўзімку 2003 г. выстаўкі мірскай «Батлейкі» ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі пад назвай «Свет Міра».

Свет «Мірскай батлейкі» — гэта не толькі свет народнага тэатра, лялек, дэкарацый, інтэрмедый. Гэта свет ззяння нашай нацыянальнай культуры, нашай гісторыі, нашай беларускасці, гэта ўніверсум, у якім абуджаецца духоўная повязь часоў.

Багаты вопыт батлеечных спектакляў у Мірскім мастацкім вучылішчы дае падставы для выкарыстання прадстаўленняў

батлейкі ў нашым музеі як дзейснага сродку ў справе актыўнага знаёмства наведвальніка з гістарычным мінулым края.

Трэба заўважыць, што паказы батлейкі поўнасцю адпавядаюць асноўным напрамкам музейнай педагогікі: інфармаванню, навучанню, развіццю творчых навыкаў, міжасабовых зносінаў, адпачынку.

У пачатку кожнага тэматычнага прадстаўлення ў гульнёвай форме падаюцца звесткі пра тыя ці іншыя экспанаты альбо нават экспазіцыі, з якімі суадносіцца тэматыка прадстаўлення. На другой ступені асваення музейнай інфармацыі — навучанні — у ходзе спектакля ідзе перадача і засваенне пэўных ведаў, прычым паказ набывае рысы своеасаблівай музейнай камунікацыі, заснаванай на дабраахвотнасці і нефармальнасці выбару тэматыкі прадстаўлення, якое заснавана на экспрэсіўнасці дзеяння, разнастайнасці і сапраўднасці музейных прадметаў. На трэцяй, вышэйшай ступені спасціжэння музейнай інфармацыі, батлеечнае прадстаўленне фарміруе працэс развіцця творчых пачаткаў асобы. Пры гэтым выкарыстоўваецца ўвесь патэнцыял духоўнай і матэрыяльнай культуры музея. У музеі як нідзе існуюць асаблівыя ўмовы для стымулявання творчага працэсу. Батлеечныя прадстаўленні дазваляць кожнаму «ўвайсці» ў сістэму лепшых прыкладаў, узораў, традыцый культуры мінулага.

Такім чынам, батлейка дапамагае спалучыць у сабе асноўныя формы культурна-асветніцкай музейнай дзейнасці, дазваляючы кожнай асобе рэалізаваць сябе ў выбраным напрамку.

Батлейка праз шмат стагоддзяў не змяніла сваёй структуры і акцёрскіх прыёмаў, а значыць, яна захавала і дух нацыянальнай культуры. Таму выкарыстанне батлейкі дазволіць наведвальніку быццам бы стаць удзельнікам далёкіх гістарычных падзей і разам з тым — творцам гістарычных вобразаў. Апынуўшыся ў атмасферы батлеечнага прадстаўлення, глядач здолее ў далейшым больш адэкватна ўспрымаць значнасць гістарычнага помніка.

Батлеечныя спектаклі ў Мірскім замку плануецца прысвяціць пачатку гісторыі замка і звязаць іх з родам Ільінічаў. Дарэчы, гэта будуць інтэрмедыі, прысвечаныя дзейнасці Юрыя Ільініча

на зямлі Міра, дзе больш за ўсё ўвага будзе скіравана на пачатак будаўніцтва Мірскага замка.

Сёння музейна-педагагічная дзейнасць у Мірскім замку — адзін з галоўных напрамкаў музейнай працы, перш за ўсё з дзіцячай, падлеткавай і сямейнай аўдыторыямі.

Спадзяёмся, што выкарыстанне батлеечных прадстаўленняў дапаможа інтэграваць намаганні музейных работнікаў і памкненні наведвальнікаў у выпрацоўцы новага погляду на Мірскі замак як самастойны музейны аб’ект.

Але паўнавартасная дзейнасць тэатра «Батлейка» ў сценах Мірскага замка будзе магчыма толькі пры наяўнасці асобных, спецыяльна абсталяваных для гэтага памяшканняў, што будзе рэалізавана пасля рэстаўрацыі комплексу.

**Літаратура:**

1. Беларускі фальклор. Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2005. С. 149–151.

2. Жаровіна, Г. Мірская батлейка // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. №3. С. 86–90.

3. Калнін, В. Мірская батлейка // Мастацтва». 2003. № 6. С. 35–37.

4. Народная культура Беларусі. Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2002. С. 47–49.

5. Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV — пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні: Навук.-практ.канф., 29 мая 2004 г., г.п. Мір Гродзен. вобл. / Навук.рэд. Н. Ф. Высоцкая. Мн.: ТАА «Белпрынт», 2004. 192 с.: іл.

6. Саўчук, Н. Беларуская батлейка // Беларускі гістарычны часопі». 2003. №3. С. 32–38.